Пераканаймася ў магутнасці Ружанца

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
01.10.2017 00:00



Распачынаем кастрычнік, падчас якога асаблівым чынам ушаноўваем Марыю праз ружанцовую малітву. Яна часта спадарожнічае нам у цяжкія, поўныя роспачы хвіліны.

Адразу варта прыгадаць словы св. Луцыі, візіянеркі з Фацімы: “Не існуе праблемы, якую б нельга было вырашыць пры дапамозе Ружанца”. Падчас гэтай малітвы не трэба баяцца давяраць Марыі свае радасці, клопаты і цярпенні. Наша любячая Маці заўсёды гатова прыйсці на дапамогу, але, каб зрабіць гэта, Ёй неабходны наш давер. Гэта падкрэсліў падчас адной з пілігрымак св. Ян Павел II: “Адгаворваючы Ружанец, мы размаўляем з Марыяй, з даверам даручаем Ёй усе нашы клопаты і смуткі, радасці і надзеі. Яна – радасная, балесная і хвалебная, што заўсёды побач з Сынам – адначасова прысутнічае сярод нашых штодзённых спраў”. †

Многія Пантыфікі неаднаразова адзначалі, наколькі важная і каштоўная ружанцовая малітва. Леў XIII у адной з энцыклік напісаў, што Ружанец – “самая дасканалая форма малітвы”, таму што яна з’яўляецца “моцнай абаронай веры, а ў таямніцах, што становяцца прадметам засяро- джання, указвае нам узнёслы ўзор дабрадзейнасцей”. Пій XI называў Ружанец “псалтыром Маці Божай”, “брэвіярыем Евангелля і хрысціянскага жыцця”, “містычным вянком” і “містычнай каронай”.

Св. Пій XII падкрэсліваў: “Калі прагнеце супакою ў сваёй сям’і, адгаворвайце Ружанец”. А св. Ян XXIII так моцна цаніў гэтую малітву, што кожны дзень разважаў усе яе таямніцы.

Папскае навучанне паказвае не толькі значэнне Ружанца ў гісторыі Касцёла, але таксама адзначае, што ў кожную эпоху, пачынаючы з часоў, калі жыў св. Дамінік, вернікі рознымі спосабамі даследавалі гэтую малітву, робячы яе вядомай і любімай.

Сёння ўсё больш тых, хто хоча заўсёды мець пры сабе ружанец. Многія носяць яго ў выглядзе пярсцёнка ці бранзалета. Ужо існуюць ружанцы ў форме пластыкавага прамавугольніка, які нагадвае крэдытную картачку, каб зручна было насіць яго ў кашальку. Аднак нельга дапускаць, каб ружанец станавіўся выключна “набожным амулетам”, паколькі “гэтая плённая малітва, – пісаў бл. Павел VI, – не толькі вельмі эфектыўная для спынення зла і няшчасцяў ды для аддалення бедстваў, як выразна

відаць з гісторыі Касцёла, але таксама рашуча ажыўляе хрысціянскае жыццё”.

Разважаючы адну з 20-ці ружанцовых таямніц, варта пастарацца знайсці сваё месца ў кожнай з іх, заўважыць пасланне, скіраванае менавіта да нас. Трэба таксама задаць сабе пытанне: ці падобна маё сэрца на Найсвяцейшае Сэрца Езуса і Беззаганнае Сэрца Марыі? Зрабіць рахунак сумлення, абудзіць жаль аб тым, што нам яшчэ так шмат не хапае. Менавіта тады Маці Божая ўлівае ў сэрца надзею, упэўніваючы, што з Ёю мы пераможам.

Дарагія Чытачы!

Стараймася штодзённа знаходзіць час на Ружанец і адгаворваць хаця б 1 дзясятак. Аднак трэба памятаць, што значна прыгажэйшым і больш плённым з’яўляецца разважанне кожнай таямніцы, бо тады, як напісаў св. Ян Павел II, “Ружанец вядзе нас да сузірання таямніц веры [...], ажыўляючы любоў хрысціян да Маці Божай, яшчэ выразней скіроўвае марыйную малітву да яе мэты, якой з’яўляецца праслаўленне Хрыста”.

На заканчэнне юбілейнага года давайце прымем глыбока ў сэрца абяцанне Найсвяцейшай Панны, дадзенае 100 гадоў таму ў Фаціме: “Штодзённа маліцеся Ружанец, каб здабыць спакой для свету і канец вайны!”. Давайце пераканаемся ў магутнасці марыйнай малітвы на ўласным вопыце і падзелімся гэтым адкрыццём з іншымі. Нахай Ружанец стане малітвай усіх у кожны час і ў любым месцы на зямлі!